7. НАРБ. – Ф. 265. – Воп. 1. – Спр. 2583. Материалы о состоянии работы по белорусизации в ЦП профсоюзов и фабзавкомах, 1928–1929 гг.

8. НАРБ. – Ф. 265. – Воп. 1. – Спр. 2585. Материалы по организации культмассовой работы среди членов профсоюзов и работе профсоюзных клубов, 1928–1929 гг.

9. НАРБ. – Ф. 265. – Воп. 1. – Спр. 4026, арк. 185–187. Сведения о работе профсоюзов Беларуси.

10. НАРБ. – Ф. 265. – Воп. 1. – Спр. 2944. Сведения ЦСПСБ о проведении белорусизации и обслуживании нацменьшинств профсоюзами БССР, 1930–1931 гг.

11. Матэрыялы да справаздачы Цэнтральнага савету прафсаюзаў БССР 7-му Усебеларускаму з'езду прафсаюзаў. – Мінск, 1932. – 183 с.

12. НАРБ. – Ф. 265. – Воп. 1. – Спр. 2437. Пратаколы пасяджэнняў Прэзідыума ЦСПСБ, 1929 г.

## Этнічныя стэрэатыпы жыхароў Беларусі па матэрыялах вуснай гісторыі

Кедрык Т. В. г. Мінск, БНТУ

Этнічная ідэнтычнасць жыхароў Беларусі з'яўляецца міждысцыплінарным прадметам даследавання, яе вывучэннем займаецца этнаграфія, антрапалогія, этнапсіхалогія, сацыялогія, гісторыя. Пад ідэнтычнасцю варта разумець працэс атаясамлення індывіда ўнутры сацыяльнай групы, дзе ў працэсе ўзаемадзеяння "Я-вобраз" замяшчаецца на калектыўны "Мы-вобраз". Для асэнсавання ўласнай ідэнтычнасці і ўзнаўлення ідэнтычнасці групавой, чалавеку неабходна наяўнасць стэрэатыпаў у адносінах да іншых груп. Фарміраванне стэрэатыпнага "Яны"-вобраза дапамагае больш выразнаму ўсведамленню "Мы"-вобраза. "Я", "Мы" і "Яны" утвараюць сабой сістэму элементаў, дзе кожная пазіцыя звязана з іншымі адносінамі тоеснасці і адрознення.

Праблема нацыянальнай ідэнтычнасці варта разглядаць у сувязі з праблемай нацыянальнага стэрэатыпу. Як і ўсякі стэрэатып, ён з'яўляецца своеасаблівым сацыяльным канструктам, спрыяе арыентацыі індывіда ў жыцці, выступае крыніцай матывацыі

грамадскіх дзеянняў. Стэрыатып, у т. л. этнічны і нацыянальны, цесна звязаны з моўным фактарам і, падобна нацыянальнай ідэнтычнасці, мае дыскурсіўную прыроду. Індывід ажыццяўляе самаідэнтыфікацыю з тымі стэрэатыпамі, якія існуюць у групавой культуры. Пры гэтым стэрэатыпы маюць дамінуючы характар, так як успрымаюцца праз працэс сацыялізацыі.

Паняцце "стэрэатып" было ўведзена У. Ліпманам у працы "Грамадская думка" [2], дзе ён ахарактарызаваў стэрэатып як "характэрную з'яву штодзённай свядомасці, заснаваную на імкненні чалавека ў працэсе пазнання навакольнага свету падвесці разнастайнасць свету пад пэўныя катэгорыі і тым самым палегчыць сабе ўспрыняцце, разуменне, ацэнку навакольных з'яў".

У. Ліпман вылучыў наступныя характарыстыкі і ўласцівасці стэрэатыпу:

узнікае з "непазбежнай патрэбы ў эканоміі высілкаў" у камунікацыі, у працэсе засваення вопыту іншых людзей, груп, папярэдніх пакаленьняў, вопыту, замацаванага ў выглядзе звыклых уяўленняў;

спрыяе распаўсюджванню традыцый і звычак;

дзеліць свет на дзве палярныя катэгорыі – "сваё", або "знаёмае" і "чужое" або "незнаёмае";

нясе ў сабе ацэначны элемент, які выступае ў выглядзе установак і асаблівасцей эмацыйных адносін і заўсёды сацыяльна дэтэрмінаваны, суаднесены з групавымі пачуццямі і каштоўнасцямі;

валодае ўнікальнай устойлівасцю, ён альбо зусім не змяняецца, альбо паддаецца зменам з вялікай цяжкасцю;

спрашчае ўспрыняцце, ацэнку і паводзіны аб'екта, служачы, такім чынам, інструментам псіхалагічнай абароны групы, яе інтарэсаў і каштоўнасцяў;

спрыяе працэсу станаўлення сацыяльна-псіхалагічнага адзінства групы [2].

На падставе агульных характарыстык стэрэатыпа можна даць вызначэнне этнічнага стэрэатыпа як "спрошчанага, схематызаванага, эмацыйна афарбаванага і надзвычай устойлівага вобраза этнічнай групы ці супольнасці, які распаўсюджваецца на ўсіх яе прадстаўнікоў" [4, с. 251].

Этнічныя стэрэатыпы прынята падзяляць на аўтастэрэатыпы і гетэрастэрэатыпы. Аўтастэрэатыпы – гэта характарыстыкі

этнічнай групы, якія ўвасабляюцца ў выглядзе спецыфічных вобразаў, меркаванняў, ацэнак яе прадстаўнікамі саміх сябе. Пры станаўленні аўтастэрэатыпа вялікую ролю маюць факты ўласнай гісторыі, асабліва шырока вядомыя прадстаўнікам групы (версіі паходжання, легенды, нацыянальныя героі). Многія падзеі і з'явы далёкага мінулага і сёння складаюць частку эмацыйнага вопыту этнічных супольнасцяў, уключаючыся ў сістэму нацыянальных сімвалаў.

У адносінах да сваёй этнічнай групы фармуюцца, часцей, станоўчыя характарыстыкі і пачуцці. Нацыянальныя аўтастэрэатыпы і пачуцці, гэтак жа як і ідэнтыфікацыя, і сістэма знакаў і ўяўленняў, адносяцца да сферы этнічнай самасвядомасці.

Гетэрастэрэатыпы – гэта сукупнасць ацэначных меркаванняў пра іншыя народы. Яны могуць быць як станоўчымі, так і адмоўнымі, у залежнасці ад гістарычнага вопыту ўзаемадзеяння дадзеных этнічных груп. У змесце гетэрастэрэатыпаў варта адрозніваць адносна ўстойлівае кагнітыўнае ядро – комплекс уяўленняў аб знешнім выглядзе прадстаўнікоў іншага народа, аб яго гістарычным мінулым, асаблівасцях ладу жыцця, працоўных навыках, а таксама шэраг зменлівых меркаванняў адносна камунікатыўных і маральных якасцей дадзенага народа.

Стаўленне да сваёй групы (аўтастэрэатып) і чужой групы (гетэрастэрэатып) можна разглядаць ізалявана адзін ад аднаго толькі ў абстракцыі, як метадычны прыём для іх больш дэталёвага вывучэння. У рэчаіснасці, жыццядзейнасці этнічнай групы яны выступаюць як неразрыўнае цэлае, як адна з форм адлюстравання групай свайго адзінства і адрознення ад іншых этнічных груп. Аўта- і гетэрастэрэатыпы уяўляюць сабой узаемазалежныя элементы ў структуры этнічнага стэрэатыпа.

Даследчыкі вылучаюць тры ўзроўні існавання этнічных стэрэатыпаў: узровень паводзін, кагнітыўны і афектыўны ўзроўні. [1, с. 118] Узровень паводзін уяўляе сабой праграму дзеянняў у адносінах да групы, якая з'яўляецца аб'ектам стэрэатыпізацыі. Ён мае месца ў канкрэтных учынках адносна сваёй ці чужой этнічнай групы у розных жыццёвых сітуацыях.

Кагнітыўны ўзровень стэрэатыпа выражаецца ў меркаваннях яго носьбіта адносна канкрэтнага этнаса і яго прадстаўнікоў. На ім замацаваныя ўяўленні аб фізічных, маральных, разумовых якасцях

сваёй ці чужой этнічнай супольнасці. Дадзены узровень утрымлівае інфармацыю аб феноменах, якія рацыянальна асэнсаваныя.

Афектыўны ўзровень – найбольш глыбінны пласт этнічнага стэрэатыпа. Гэта той кампанент, які “папярэднічае розуму”, ён уключае ў сябе пачуцці сімпатыі і антыпатыі, ён суб’ектыўны і эмацыйны. Афектыўны кампанент часта не ўсведамляецца яго носбітам і праяўляецца ў нязмушаных эмацыйных рэакцыях.

Даследаванне кожнага з узроўняў этнічных стэрэатыпаў можа ажыццяўляцца метадамі розных соцыя-гуманітарных дысцыплін, у тым ліку вуснай гісторыі. У працэсе вуснагістарычнага даследавання гісторык мае непасрэдны кантакт з носьбітамі стэрэатыпаў і можа зафіксаваць не толькі кагнітыўны ўзровень – меркаванні і выказванні пра якасці і характэрыстыкі сваёй ці чужой групы, але і эмацыйную рэакцыю, сімпатыі і антыпатыі рэспандэнта.

Прадметам даследавання дадзенага артыкула з’яўляюцца аўта- і гетэрастэрэатыпы жыхароў Беларусі, зафіксаваныя ў матэрыялах вуснагістарычных экспедыцый, праведеных Беларускім архівам вуснай гісторыі http://www.nashapamiac.org.

Беларускі архіў вуснай гісторыі з 2011 г. ажыццявіў шэраг вуснагістарычных экспедыцый у розныя рэгіёны Беларусі і на сёння ўключае больш за 700 інтэрв’ю. Асноўныя метады, якія выкарыстоўваліся падчас даследавання – аўтабіяграфічная нарацыя і тэматычны апытальнік. Рэспандэнтамі звычайна з’яўляліся жыхары вёсак і райцэнтраў пераважна 1920–1930 гг. нараджэння, у большасці беларусы паводле этнічнага самавызначэння. Этнічныя стэрэатыпы не былі адмысловым аб’ектам даследавання экспедыцый, але сабраны матэрыял прадстаўляе багатую факталагічную базу для іх вывучэння, бо фактычна кожнае інтэрв’ю ўтрымлівае інфармацыю пра міжэтнічныя стасункі, якія ў першай палове XX ст. былі значна больш разнастайнымі. Варта адзначыць, што ў значнай частцы прааналізаваных інтэрв’ю характарыстыкі этнічных груп фіксуюцца ў нязмушаным аўтабіяграфічным аповедзе, калі рэспандэнты распавядалі пра жыццё вёскі і падзеі ўласнага жыцця, што сведчыць пра існаванне і ўстойлівасць этнічных стэрэатыпаў у свядомасці жыхароў Беларусі.

Для аналіза матэрыялаў Архіва з пункту гледжання вывучэння этнічных стэрэатыпаў, важна зрабіць некалькі папярэдніх заўваг.

Рэспандэнты – гэта асобы ва ўзросце 70–80 гадоў, а фармаванне этнічных стэрэатыпаў адбывалася падчас сацыялізацыі, прыкладана каля 55–60 гадоў таму, калі этнічны ландшафт іх мясцовасці быў іншы. Значнымі этнічнымі групамі, з якімі мелі штодзённы кантакт беларусы ў першай палове XX ст. былі яўрэі і палякі, у некаторых рэгіёнах сустракаліся невялікія супольнасці іншай этнічнай прыналежнасці, напрыклад, татары, літоўцы, украінцы, рускія. У выніку падзей сярэдзіны XX ст. змяніўся этнічны склад беларускіх вёсак і гарадоў – пасля Халакосту амаль знікла яўрэйская супольнасць, пасляваенная калектывізацыя ў Заходняй Беларусі і выезды ў Польшчу значна зменшылі колькасць палякаў. Савецкая ўлада зліквідавала старую структуру грамадства, дзе этнічная прыналежнасць была шчыльна звязана з пэўным месцам у соцыуме. Таму ў інтэрв'ю даследчыкі часта маюць справу са "сцёртымі" ўяленнямі, якія з часам згубілі актуальнасць і засталіся ў памяці у "рэшткавай" форме. Таксама важна ўсведамляць, што існуе праблема ступені адкрытасці рэспандэнтаў, бо перажытыя падчас XX ст. падзеі навучылі чалавека быць асцярожным у ацэнках і выказваннях і суадносіць свае ўласныя меркаванні з афіцыйныі пунктам гледжання, а часта яшчэ савецкай ідэалогіяй, якая выхоўвала грамадства ў духу інтэрнацыяналізма і асуджэння ўсялякіх праяў нацыяналізма, шавінізма і антысемітызма.

У якасці аўтастэрэатыпа будзе прааналізаваны вобраз беларуса, а ў якасці гетэрастэрэатыпаў вобразы яўрэя і паляка, як найбольш шматлікіх этнічных супольнасцей з якімі мелі дачыненне беларусы. Яўрэі і палякі для беларуса ўяўляюць вобраз "іншага", "чужога", які перш за ўсё звязаны з рэлігійнымі, моўнымі і сацыяльнымі адрозненнямі. Антраполагі вылучаюць шматступеневую градацыю катэгорый "свае/чужыя" – "свае" – "свае іншыя" – "іншыя" – "чужыя" – "ворагі" [3].

Спачатку варта звярнуцца да этнонімаў і іншых назваў этнічных груп, якія ўжываюць рэспандэнты. У свядомасці жыхароў Беларусі адбылося атаясамленне этнічнай і канфесійнай прыналежнасці, паняцці паляк/католік, беларус/праваслаўны ўжываюцца як сінонімы, таксама часта для самавызначэння беларусы выкарыстоўваюць тэрмін "рускай веры", што значыць праваслаўны. Для называння яўрэйскай этнічнай супольнасці ў роўнай ступені выкарыстоўваюцца тэрміны "яўрэй" і "жыд", якія могуць мець як

нейтральную, так і адмоўную канатацыю. У адносінах да палякаў як да "іншых" выкарыстоўваецца тэрмін "пшэкі", а таксама адбылося атаясамленне этнічнага вобраза з сацыяльным становішчам – "паляк-пан". У аўтастэрэатыпе таксама адзначаецца атаясамленне не толькі этнічнай і канфесійнай прыналежнасці, але і сацыяльнага становішча: "беларус-праваслаўны-мужык".

Польская даследчыца Ганна Энгелькінг лічыць, што ідэнтычнасць беларуса / селяніна /мужыка ў самасвядомасці саміх жа беларусаў не з'яўляецца самастойнай катэгорыяй, яна ўключана ў дыхатомію пан/мужык і звязана з сялянскім міфам паходжання, які сцвярджае, што "селяніну не ўласцівыя суб'ектыўнасць і аўтаномія, бо ён з'яўляецца асобай, якая належыць пану" [5, с. 89]. Адпаведна выбудоўваецца іерархія, дзе "беларус-мужык" займае ніжэйшую пазіцыю ў параўнанні з "палякам-панам". Таму аўтастэрэатып часта мае ўсведамленне ўласнай "ніжэйшасці" і "горшасці" і ў ім пераважаюць крытычныя характарыстыкі, якія звязаны з нізкім узроўнем культуры, адукацыі, дабрабыту і маральных якасцяў. "А.С: А беларусы? Разумнейшы народ? – Я.М.: Э-э, тупіцы" (Жанчына, 1920 г., в. Дзетамля, Навагрудскі р.) "Зверскі наш народ" (Жанчына, 1923 г., г.п. Празарокі, Глыбоцкі р.) Прызначэнне "простага мужыка" – цяжкая праца на зямлі, якая і надае сэнс яго існаванню. "У супрацьлегласць да пана селянін павінен працаваць. Не ён надае сэнс працы, а праца надае сэнс яму. Прычынай існавання селяніна з'яўляецца праца. Значэнне таго, што ён робіць, мае канечны сэнс не адносна яго самога, а адносна яго працы. Прычына яго існавання заключаецца не ў ім самім, а па-за ім, у спрадвечным ладзе грамадства і свету, у якім "селянін селянінам будзе заўжды" [5, с. 96].

Стэрэатып "паляка-пана" звязаны з характарыстыкамі культурнасці, адукаванасці, высокага сацыяльнага статуса і шляхетнасці. Асабліва моцны гэты стэрэатып у Заходняй Беларусі, дзе падчас ІІ Рэчы Паспалітай палякі займалі дзяржаўныя пасады, былі настаўнікамі і вайскоўцамі. "І.К.: У вас настаўнікі былі прыезжыя? – П.А.: З Польшчы былі, усе былі з Польшчы, но я вам кажу былі настаўнікі очэнь высокай культуры, высокай, не то, што цяпер" (Мужчына, 1931 г., в. Турэц, Карэліцкі р.).

З аднаго боку "беларус-мужык" прызнае "вышэйшае" становішча "паляка-пана", з іншага, такая сітуацыя стварае яго

негатыўны вобраз, які фіксуе пыху і пагарду да мужыка. “П.С.: Скажыце, а вот вы гаварылі пра палякаў, вы перасякаліся з палякамі ўже патом? – П.Л.: С палякамі, нікакіх дзелоў. Палякаў... Вы знаеце, между прочым, каторыя семьі паляцкія асталіся тут, ані людзі худшыя, чем нашы. Нашы людзі, беларускія, лучшыя. Вот, дажа кагда па абслужыванію, вот, ездзіла ж у Западную на вызава, вот. Так ані, кажацца, нармальныя людзі, ну вот, ну, вабшче ня то, не нашы, не нашы, беларусы. Беларус, украінец эта, прастой свой чалавек, а эта ўже как-то, как-то другой веры, веры іли нацыі. Із ніх, ані ж больша, знаеце хто, ані ж католікі, ані ж не вераць, ані ж не праваслаўныя. Ты праваслаўны, значыць всё, а мы... Ані, вот еслі, дапусцім, с палякамі, ты туда папал к нім, і вот вазьмёсся ты за эту, за іхнюю ручку, ані ўже тагда памоюць после вас, кружку ані эта не... іли выбрасюць. После вас ані ня будуць, патаму што праваслаўныя бралі, вот, праваслаўныя.” (Жанчына, 1919 г., в. Шпакоўшчына, Полацкі р.).

“Іншасць” яўрэя ў стэрэатыпе замацоўваецца яшчэ мацней, бо ён не толькі не працуе на зямлі, гаворыць на іншай мове, але і верыць у іншага Бога. Сфера дзейнасці яўрэя – “заняткі”. “Жыды і зямля гэта ўзаемавыключныя катэгорыі. Жыд, у адрозненне ад сімвалічна прыпісанага да зямлі селяніна, на зямлі не працуе. Ён па вызначэнні да гэтай працы не спасобны, што, з аднаго боку, павялічвае яго інверсійныя ўласцівасці ў адносінах да селяніна, а з другога, у негатыўным адлюстраванні ўзмацняе і пацвярджае аселасць тутэйшых сялян-земляробаў, адначасова ўпісваючы ў матрыцу іх ідэнтычнасці антаганістычную апазіцыю ў адносінах да ўсіх тых, якія навалакліся, пасяліліся, прыехалі ў вёску” [5, с. 100].

Яўрэй таксама адрозніваецца аб беларуса культурнасцю і адукаванасцю, ён не ставіцца да мужыка з пагардай, але часта імкнецца яго абхітрыць і падмануць, нажыцца на ім. Часта пры расповедзе пра жыдоў рэспандэнты ўсміхаліся і без крыўды, якая адчувалася да палякаў, казалі пра іх уменне прадаць тавар і зарабіць грошы. “П.П.: Жили, по сути дела, мирно. Больших скандалов не было. Но только, так сказаць, ходили всякие слухи, шо евреи обманщики, шо они, значит, грабят людей, шо за счёт своей хитрости, комерции они наживаются на людском труде. Вот, такие разговоры велись. Они, конечно, были... и плотники, и кузнецы, ковали, и швалкі у их были, всякие мануфактуры. – А.С.: Не толькі гандаль,

но яшчэ і рамяство? Самае рознае, да? – П.П.: И аптекарь был еврей. – А.С.: А чаму на зямлі яны не працавалі? Вот, мог яўрэй купіць зямлю, грошы ж яны, хіба, мелі, заняцца зеляробствам, ці не імеў права? – П.П.: Они могли купить земли, сколько угодно, хватало, но они непривычны до земли. Не хотели працоваць на земли, потому шо на земли это тяжёлый труд. А им торговля, легчэ можна было заработать. – А.С.: Легчэ? – П.П.: Да, и прожить. Ну, крестьяне, надо сказать, у нас жили тоже и бедно, и трудно. Дело в том, шо малоземелье, мало земли было. А денег не хватало. Поэтому шли да евреев, да брали у них кредит”. (Мужчына, 1927 г., в. Моталь, Іванаўскі р.)

Важнае месца ў стэрэатыпным вобразе яўрэя займае яго рэлігійная адрознасць і сувязь у народнай свядомасці яго з датычнасцю да распяцця Хрыста і так званым “крывавым наветам”. “Ну і [усміхаецца] і хадзілі, і гэты жыдоўскі гэты рабяты і рускія. А ў аднэй жыдоўскай хаце ў суботу богу маліліся жыды, сабіралісі. А гэта, а мальцы нашы гэты рускія [смяецца] ідуць. А яны ж молюцца, усе кагалам там гэта, ці яны крычаць, ці яны пяюць, ці яны молюцца хто іх знаець, там яны. Га... [смяецца] Галдзяць усе разам там. А гэта, а мальцы падлятуць, да акна: “Свіння, свіння!” А як скажуць свіння, ім нада нанава маліцца [смяецца]. Ужо каторыя яны прамолюцца малітвы. Як закрычаць “свіння”! Гэта пад акном. Ну яны эта мальцаў прагонюць, але а нада начынаць сначала маліцца. То гэта жыдзянёнка гэтага дак ён такі, мой брат быў і ну такі, аднаго возраста. Ну і там жа меншыя. Ну, як завядуцца біцца гэта [смяецца]. Дык гэтаму жыдзянёнку, як дадуць, дадуць: “А ты нашага божаньку распінаў?” Гэта, рабяты. [смяецца] Ты – жыд, нашага, нашага божаньку ты распінаў. Смешна.” (Жанчына, 1931 г., в. Сяменчыкі, Глыбоцкі р.).

Часта можна пачуць ад рэспандэнтаў сувязь стэрэатыпа яўрэя як “не-хрысціяніна”, а нават “анты-хрысціяніта” з прычынамі Халакосту падчас Другой сусветнай вайны.

Такім чынам, аналіз матэрыялаў Архіва вуснай гісторыі дазваляе сцвярджаць пра неадназначнасць і амбівалентнасць этнічных стэрэатыпаў, мелі месца праяўленні ўсіх тыпаў міжэтнічных адносін: ад сяброўскіх і нейтральных да крытычных і непрыязных. Іх амплітуда вагалася паміж палюсамі дабразычлівасці, талерантнасці, супрацоўніцтва, перш за ўсё эканамічнага,

міжкультурнага дыялогу – і ізаляцыянізма, нецярпімасці, падазронасці, адчужэння і нават варожасці. Хоць у большасці выпадкаў на прамое пытанне "як жылі з палякамі і жадамі" рэспандэнты зазначаюць безканфліктнасць і мірнасць суіснавання.

**Выкарыстаная літаратура**

1. Белова, О.А. Исследование этнических стереотипов в рамках социологии / О.А. Белова // Социальная политика и социология. – 2009. – № 4. – С. 118–125.

2. Липпман, У. Общественное мнение. / У. Липпман. – М.: Институт фонда «Общественное мнение», 2004. – 384 с.

3. Мазько, Э. Падарожжа па-за лакальнасць: "нашыя" людзі паміж "сваім" і "чужым" светам / Э. Мазько // Памежжы Беларусі ў міждысцыплінарнай перспектыве. – Варшава, 2007. – С. 179–208.

4. Садохин, А.П. Этнология: учебник. / А.П. Садохин. – М.: Гардарики, 2006. – 287 с.

5. Энгелькінг, Г. Паміж панам і жыдом. Заўвагі пра структуру ідэнтычнасці беларускіх калгаснікаў рубяжа XX–XXI ст. / Г. Энгелькінг // Homo Historicus 2012 Гадавік антрапалагічнай гісторыі. – Вільня: ЕГУ, 2012. – С. 89–117.

## Деятельность статистических комитетов белорусских губерний по этнографическому изучению края (вторая половина XIX– начало XX в.)

Корсак О. В. г. Минск, БГУ

В XIX в. по всей Российской империи были созданы губернские статистические комитеты (ГСК), основное занятие которых состояло в сборе и обработке статистических сведений для Министерства внутренних дел. Помимо основных обязанностей, члены ГСК занимались проведением археологических раскопок, участием в различных выставках и съездах, созданием музеев, а также написанием работ, которые затем публиковались в изданиях комитетов («Памятных книжках», «Сборниках», «Трудах» и т. д.).

Статистические комитеты белорусских губерний были созданы в 1835 г., однако, продолжительное время их деятельность носила